Экспертыза пытання

АБ'ЯДНОЎВАЦЬ І ЎЗВЫШАЦЬ ГРАМАДСТВА

Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ — пра сімвалы, якія выкарыстоўваюцца на беларускіх мітынгах апошніх дзён:

— Неабходна адзначыць, што сучасная дзяржаўная сімволіка нашай краіны выразна перадае гісторыка-культурную спадчыну беларускага народа, падкрэслівае яго нацыянальны і грамадзянскі дух, дае ўяўленне аб айчынных духоўных каштоўнасцях.

Чырвоны, зялёны і белы колеры беларускага сцяга абумоўлены як гістарычна, так і светапоглядна, звязаныя з духоўнымі вытокамі нашага народа.

Чырвоны колер здаўна сімвалізуе сонца — галоўную жыватворную крыніцу энергіі. Разам з тым ён увасабляе волю, мужнасць, высакароднасць. Менавіта пад чырвонымі сцягамі Чырвоная Армія і беларускія партызаны вызвалялі нашу зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Зялёны колер — гэта не толькі сімвал Прыроды, але і сімвал маладосці, энергіі любові, вясны і адраджэння, колер шчодрасці, дабрыні і стваральнай працы.

Белы колер сімвалізуе духоўную чысціню, святасць, мудрасць, згоду, свабоду і веды. Ён адпавядае назве нашай краіны «Белая Русь».

Найважнейшая асаблівасць Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь — выкарыстанне нацыянальнага арнаменту як элемента дзяржаўнай сімволікі. Гэта надзвычай рэдкая з'ява на сцягах дзяржаў свету.

Арнамент са старажытных часоў быў характэрным знакам, адметнай рысай усіх культурных народаў.

У аснову арнаменту на Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь пакладзены ўзор «Узыходзячае сонца», вытканы на ручніку ў 1917 годзе сялянкай вёскі Касцелішча на Сенненшчыне Матронай Маркевіч. У ім выкарыстаны старажытныя сімвалы земляробства — ромбы, графічныя варыяцыі якіх вядомыя археолагам па знаходках на тэрыторыі Беларусі. Цэнтральнае месца займае выцягнуты па вертыкалі ромб, ад якога зверху і знізу адыходзяць загнутыя лініі. На працягу тысячагоддзяў ён увасабляе жыватворную энергію сонца і матчынны, жаночы пачатак Зямлі, звязаныя з імі ўрадлівасць глебы і стваральную сілу працы.

У цэнтры галоўнага ромба — дзве перакрыжаваныя лініі з чатырма кропкамі паміж імі. Гэта — старажытны сімвал засеянага поля. Яго таксама трактуюць як «ключ да шчасця», магічнае пажаданне спрыяльнага развіцця падзей. Да таго ж ромб з крыжам — яшчэ адзін старажытны сімвал узыходзячага сонца.

Злучаныя парамі ромбы зверху і знізу арнаменту сімвалізуюць ідэю падаўжэння жыцця. Увесь узор пранізвае ідэя дабра, надзеі на лепшае, пажадання дабрабыту, урадлівасці і росквіту.

Размяшчэнне чырвонага арнаменту на белым фоне адпавядае традыцыям беларускага арнаментальнага мастацтва, у якім, як правіла, на белую аснову нанесены каляровы (часцей за ўсё чырвоны) узор.

Тры паласы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь — гарызантальныя чырвоная і зялёная, вертыкальная белая з чырвоным арнаментам — нясуць пажаданне дабра, поспеху і росквіту нашай краіне, усім яе грамадзянам.

Звернемся да гісторыі бел-чырвона-белага сцяга. Першае. Калі і кім быў створаны бел-чырвона-белы сцяг? Па ўласным сведчанні дзеяча беларускага нацыянальнага руху Клаўдзія Сцяпанавіча Душэўскага (Дуж-Душэўскага), аўтарам эскіза бел-чырвона-белага сцяга быў менавіта ён. У прыватнасці, у аўтабіяграфіі ён пісаў наступнае: «Цікава адзначыць, што беларусы лічылі сваім дзяржаўным сцягам той, што і літоўцы, г. зн. Белую Пагоню на чырвоным полі, але нацыянальнага сцяга не было. Мне давялося зрабіць некалькі праектаў нацыянальнага сцяга, і адзін з іх быў прыняты, менавіта: бел-чырвона-белы». Увесну 1917 года ў Петраградзе над будынкам Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны лунаў такі сцяг.

Другое. Калі і кім выкарыстоўваўся бел-чырвона-белы сцяг? Бел-чырвона-белы сцяг — афіцыйны сцяг Беларускай Народнай Рэспублікі. У 1919—1920 гадах розныя варыяцыі бел-чырвона-белага сцяга выкарыстоўваліся беларускімі вайсковымі фарміраваннямі ў Літве і Польшчы. У 1920 годзе бел-чырвона-белым сцягам карысталіся кіраўніцтва Слуцкага паўстання і ваенныя фарміраванні С. Булак-Балаховіча.

Бел-чырвона-белы сцяг выкарыстоўваўся беларускім рухам у Заходняй Беларусі: Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй, Таварыствам беларускай школы, Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры і іншымі.

Пэўная частка беларускай інтэлігенцыі, якая жыла ў эміграцыі і знаходзілася ў апазіцыі да Савецкай улады, пасля прыходу нацыстаў распачала спробу ўстанаўлення супрацоўніцтва з мэтай стварэння беларускай дзяржавы пад пратэктаратам Германіі. З першых дзён акупацыі тэрыторыі Беларусі яны паспрабавалі на практыцы ажыццявіць задуманае, прыступіўшы да стварэння беларускай дапаможнай адміністрацыі.

Крах плана «Барбароса», параза ў Маскоўскай бітве, ваенныя падзеі вясны — лета 1942 года запатрабавалі новых людскіх рэсурсаў для барацьбы з Чырвонай Арміяй. Беларускія калабаранты скарысталіся гэтай сітуацыяй з мэтай дамагчыся ад германскай акупацыйнай адміністрацыі стварэння Беларускай самаабароны ў якасці асновы будучай беларускай арміі. Дазволіўшы стварэнне Беларускай самаабароны, гаўляйтэр Вільгельм Кубэ даў дазвол 27 ліпеня 1942 года на выкарыстанне на тэрыторыі Генеральнага камісарыята «Беларусь» бел-чырвона-белага сцяга і герба «Пагоня».

Пазней, 21 снежня 1943 года, у Мінску, размешчаным на акупаванай у той момант тэрыторыі, была ўтворана калабарацыянісцкая Беларуская цэнтральная рада (БЦР) з аналагічнай сімволікай.

Бел-чырвона-белы сцяг выкарыстоўваў створаны нацысцкімі акупантамі «Саюз беларускай моладзі».

27 чэрвеня 1944 года ў Мінску з ініцыятывы БЦР адбыўся Другі Усебеларускі кангрэс — з'езд прадстаўнікоў беларускіх калабарацыйных арганізацый і іншых асоб, лаяльных у адносінах да германскіх акупацыйных улад. З сімволікай бел-чырвона-белага сцяга быў праведзены парад калабарацыйнага фарміравання Беларускай краёвай абароны.

Пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР і перайменавання яе ў Рэспубліку Беларусь 19 верасня 1991 года Вярхоўны Савет прыняў Закон «Аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь», які зацвердзіў у якасці дзяржаўнага сімвала бел-чырвона-белы сцяг. Аднак ён быў негатыўна ўспрыняты значнай часткай беларускага грамадства, у тым ліку ветэранскімі арганізацыямі, з-за яго выкарыстання беларускімі калабарантамі падчас акупацыі БССР войскамі нацысцкай Германіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Па выніках рэферэндуму, які адбыўся 14 мая 1995 года, дзяржаўны сцяг быў заменены.

Безумоўна, бел-чырвона-белы сцяг з'яўляецца часткай беларускай гісторыі. Але мы павінны памятаць усе факты, звязаныя з яго выкарыстаннем. Можна па-рознаму ставіцца да гэтага знака, але для мяне бясспрэчна, што нацыянальна-дзяржаўныя сімвалы павінны аб'ядноўваць, а не раз'ядноўваць грамадства.

Больш за тое, давайце задумаемся: незалежна ад нашага стаўлення да бел-чырвона-белага сцяга, якія вынікі выкарыстання гэтага сімвала ў нашай гісторыі? А яны адмоўныя: БНР рэальнай дзяржавай не стала, Слуцкае паўстанне і ваенныя фарміраванні С. Булак-Балаховіча былі разгромленыя, беларускія нацыянальныя арганізацыі ў Заходняй Беларусі былі ліквідаваныя польскімі ўладамі, беларуская калабарацыя пацярпела крах, першая палова 1990-х гадоў у гісторыі суверэннай Рэспублікі Беларусь была часам найцяжэйшага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага крызісу. Значыць, відавочна нешта не так з гэтым сімвалам. І я вельмі сумняваюся, што Рэспубліка Беларусь можа прыйсці да росквіту пад бел-чырвона-белым сцягам.

Разам з тым менавіта пад чырвона-зялёным сцягам з найстаражытнейшым беларускім арнаментам мы дасягнулі выдатных сацыяльна-эканамічных, навуковых і культурных вынікаў у БССР і сучаснай Рэспубліцы Беларусь. Задумайцеся, паважаныя суграмадзяне!

З нагоды

За мір і спакой, супраць расколу

Учора ў музеі Мінскага метрапалітэна стартавала акцыя Беларускага саюза жанчын «Жанчыны за адзінства і мір». Па словах намесніка старшыні грамадскага аб'яднання, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Лініі АНАНІЧ, Беларускі саюз жанчын апошнім часам актыўна ўдзельнічае ў акцыях, мітынгах за спакойную, стабільную Беларусь.

Арганізатарам учарашняга мерапрыемства стала мінская гарадская арганізацыя грамадскага аб'яднання. Жанчыны Беларусі такім чынам выступаюць за мір, спакой і супраць расколу грамадства.

«Мы кажам, што нам не падабаецца сітуацыя, калі мы не можам спакойна збіраць дзяцей у школы, не адчуваем сябе абароненымі. Таму мы заклікаем усіх да спакою, міру. Трэба рыхтаваць дзяцей да школы, мірна працаваць, ствараць нашу Беларусь і адстойваць нашы каштоўнасці», — сказала Лілія Ананіч і дадала, што акцыі такога кшталту грамадскае аб'яднанне будзе працягваць.

Таксама Лілія Ананіч выказала сваё меркаванне наконт грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне: «Вось падумалася, як гэта — быць не ў ладах са сваім сумленнем, мяняць перакананні як пальчаткі? І пры гэтым паказваць, быццам раптоўна «стаў відушчым» і аднёсся з пагардай? Падзеі жніўня і лёсавызначальны выбар агалілі многіх асоб. І добра б хлопцаў і дзяўчат, якія абдумваюць жыццё (заблыталіся ў сетках? Паддаліся парыву натоўпу або лжывым аўтарытэтам? Ці «не адрознілі» бутэльку з запальнай сумессю ад бутэлькі кока-колы? Цяжкае дзяцінства?..) На жаль, у адносінах да некаторых людзей, у тым ліку і маіх сеткавых падпісчыкаў, гэта пытанні. Мне лягчэй. Перакананняў не мяняла і не змяняю. І сцяг краіны, чырвона-зялёны, мой сцяг. І нацыянальны лідар для мяне наш Прэзідэнт, Аляксандр Лукашэнка. Трымаем удар! Мацуем шэрагі! Перамаглі і перамогу не аддадзім! Як спадкаемцы Вялікай Перамогі! Як прадстаўнікі суверэннай незалежнай Беларусі! За Беларусь!»

Парламентарый задае пытанне: ці не перадвыбарчыя мітынгі сталі сігналамі да масавых пратэстаў і парушэнняў?

«Я жахалася рыторыкі «не баяцца аўтазакаў», параўнання Беларусі са старым драндулетам. Ніхто з альтэрнатыўшчыкаў і не спрабаваў хоць словам добрым аб'ектыўна адгукнуцца пра краіну і пра Прэзідэнта. Але курс сацыяльнай дзяржавы выбіраў сам народ, і мы ўсе яго творцы!» — адзначыла Лілія Ананіч.

Яна адназначна асуджае абразы, прыніжэнні ўсіх, хто мае іншы пункт гледжання, і гвалт.

«Гвалт не прымаю. Я таксама маці і жывы чалавек. Мне таксама душа баліць за тое, што здарылася. І ў першую чаргу за тых маладых хлопцаў, хто прысягаў радзіме і хто быў па службе на лініі супрацьстаяння. І супраць каго накіроўваліся запальныя сумесі і тараны. Нам усім трэба знайсці адказ на многія пытанні, у тым ліку і на самае галоўнае, чаму бацькі не зберагліся сваіх дзяцей і сёння ў захапленні асабістым удзелам у «барацьбе» з уладай цягнуць на пратэсныя вуліцы малалетніх? Дзе гарантыя, што натоўп утрымаецца ў мірным рэчышчы? Каго зноў будзем вінаваціць?» — падкрэслівае парламентарый.

Лілія Ананіч звяртае ўвагу і на тое, што гаворка ідзе пра змену курсу. «І нават без агучвання па складзе ўдзельнікаў з ліку завадатараў, а таксама тых, хто да іх прымазаўся, гэта ясна як божы дзень. Менавіта праз развал эканомікі і імкнуцца асядлаць хвалю пратэсных настрояў. Заклікі на дапамогу «сяброў» усіх масцей і не хаваюць ужо», — выказвае думку намеснік старшыні Пастаяннай камісіі.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў звярнула ўвагу і на сімвал пратэстаў — бела-чырвона-белы сцяг: «Пад гэтым сцягам палілі і катавалі нашу Беларусь фашысты і іх паслугачы. З нарукаўнікамі бела-чырвонага колеру былі прыслужнікі нацыстаў, якія палілі родную хату і жывымі маю бабулю з прабабуляй у вёсцы Дунаі на Лагойшчыне. Гэта мой погляд і маё асабістае перакананне».

Лілія Ананіч рэзюмуе: «Вельмі хачу, каб вярнулася галоўнае — спакой і ўзаемапавага адно да аднаго. Каб мы сталі мацнейшыя і каб квітнела наша краіна».

На слыху

А сігнал мусіць быць дарэчы

Раз-пораз вуліцы гарадоў Беларусі агалошваюцца масавымі гукавымі сігналамі кіроўцаў. Але наколькі гэта правамерна? Сітуацыю пракаментавалі ў Галоўным ўпраўленні Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі.

— Так, апошнім часам паступае шмат скаргаў ад грамадзян на шматлікія гукавыя сігналы ад аўтамабіляў. ДАІ прымае меры па навядзенні парадку. У кожным выпадку інспектарамі выкарыстоўваецца індывідуальны падыход. Калі гукавы сігнал быў пададзены з парушэннем, то адказнасць надыходзіць па артыкуле 18.14 КаАП. Пункт 2 гэтага артыкула цягне папярэджанне або штраф у памеры да трох базавых велічынь. Але калі праз ціск на клаксан была створана аварыйная абстаноўка, то санкцыя ўзмацняецца — за гэта прадугледжаны штраф памерам ад 5 да 20 базавых велічынь. Пры гэтым кіроўца можа быць пазбаўлены права кіравання транспартным сродкам на тэрмін да двух гадоў.

Як удакладнілі ў ДАІ, аварыйная абстаноўка ўзнікае ў тым выпадку, калі іншыя ўдзельнікі дарожнага руху — як кіроўцы, так і пешаходы — палохаюцца і праз гэта рэзка змяняюць хуткасць і напрамак руху, ад чаго рэзка ўзрастае рызыка дарожнага-транспартнага здарэння.

Аляксандр КАВАЛЁЎ.